Выразите длину окружности, выполнив задание 4 рабочего листа[5]. (Рисунок 7).

Третья задача урока выполнена.

**V. Этап первичной проверки понимания полученных знаний.**

*Педагогическая задача: установить правильность и осознанность освоение учащимися изученного материала.*

Вычислите длину окружности, используя данные практической работы и формулу (задание 5 рабочего листа). (Рисунок 8).

5 Вычислите длину окружности по формуле, используя данные таблицы из задания 3. Сравните результат и сделайте вывод.

С = ……………………………….

Рисунок 8

*Учащиеся выполняют задание. В ходе фронтальной беседы озвучивают полученные результаты, делают вывод совпадении результатов, о рациональности использования формулы.*

**VI. Этап практического применения знаний.**

*Педагогическая задача: применение новых знаний при решении практико-ориентированных задач.*

Достаточно ли нам знать формулу? Возвращаемся к четвертой задаче урока – применять полученные на уроке знания при решении практических задач.

Выполните задание 6 рабочего листа – решите задачи. (Рисунок 9).

6 Решите задачи (для девочек).

а) Определите длину кружева, которое потребуется для отделки одной круглой салфетки радиусом 10 см. Число $\pi$ принять равным 3,14.

Ответ: ………………..

б) Определите длину кружева, которое потребуется для отделки 5000 круглых салфеток радиусом 10 см. Число $\pi$ принять равным 3.

Ответ: ………………..

6 Решите задачи (для мальчиков ).

а) Нужно построить забор вокруг круглого бассейна. Радиус бассейна 10 м. Число $\pi$ принять равным 3,14.

Ответ: ………………..

б) Нужно построить забор вокруг круглого бассейна на определенном расстоянии. Радиус бассейна 10 м, а забор нужно поставить на расстоянии 10 м от бассейна. Число $\pi$ принять равным 3.

Ответ: ………………..

Рисунок 9

*Учащиеся решают задачи с самопроверкой по образцу на доске.*

**VII. Этап информирования о домашнем задании.**

*Педагогическая задача: обеспечить учащимся цели, содержания и способов выполнения домашнего задания.*

Гл.6, п.2, № 39, 41 или придумайте 2 практические задачи на вычисление длины окружности.

Найдите информацию о числе π и подготовьте сообщение (по желанию).

**VIII. Этап подведения итогов урока.**

*Педагогическая задача: дать словестную оценку работы класса и отдельных учащихся.*

Учитель дает словесную оценку работы по достижению цели урока как всего класса, так и отдельных учащихсяс учетом их работы на всех этапах учебной деятельности. Отметка учащимся будет выставлена после проверки рабочих листов с учетом работы учащихся на уроке.

**IX. Рефлексия.**

*Педагогическая задача: самооценка учащимися результатов деятельности на уроке.*

Учащимся предлагается дать оценку результатам своей деятельности на уроке, продолжив фразы:

На уроке я узнал...

На уроке смог...

У меня возникли проблемы при ...

К моим успехам можно отнести...

Я оценю свою работу на уроке... баллами, так как...

*Учащиеся сдают рабочие листы на проверку.*

*Дата поступления в редакцию: 23.09.2023*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ФАКУЛЬТАТЫЎНАГА ЗАНЯТКА «ВЫТОКІ РОДНАЙ МОВЫ» Ў II КЛАСЕ ПА ТЭМЕ «ЦІКАВАЯ АГАРОДНІНА»

*Галава Ірына Уладзіміраўна*

**Мэта:** плануецца, што ў канцы занятка вучні ўдакладняць веды пра пэўную агародніну.

**Задачы:**

стварыць умовы для актыўнай пазнавальнай дзейнаці вучняў па засваенні тэмы і выкарыстанні атрыманых ведаў;

стварыць умовы для знаемства навучэнцаў з творамі дзіцячай літаратуры аб раслінах агароду;

садзейнічаць развіццю маўленчай дзейнасці праз слуханне, гаварэнне і чытанне, фарміраванне актыўнага слоўнікавага запаса;

спрыяць выхаванню ў вучняў цікавасці да роднай мовы, яе адметнасці, уважлівасці да роднай прыроды;

спрыяць выхаванню беражлівых адносін да свайго здароўя.

**Абсталяванне:** наглядна-дэманстрацыйны і раздатачны матэрыял. (Дадатак 1–9).

### Ход занятка

**I. Арганізацыйны этап.**

*Забеспячэнне псіхалагічнай гатоўнасці класа да ўрока, увагі вучняў.*

*Да суседа павярніся*
*І яму ты ўсміхніся.*
*А цяпер за парту сядзь,*
*Час занятак пачынаць.*

**II. Этап актуалізацыі ведаў вучняў.**

*Забеспячэнне матывацыі для навучання, актуалізацыя суб'ектнага вопыта навучэнцаў.*

**Інтэрактыўны метад «Кросэнс».**

Звярніце ўвагу на дошку. Успомніце пра якую агародніну мы вялі размову, паглядзіце на гэтыя малюнкі і адкажыце, чаго ў кожнага з іх не хапае? *(На дошцы размешчаны кросэнсы «Бульба», «Морква», «Бурак»).* (Малюнак 1).

**III. Этап паведамлення тэмы і мэты ўрока.**

*Забеспячэнне ўключэння вучняў у сумесную дзейнасць па вызначэнні тэмы занятка.*

Я захавала для вас невялікае пасланне. Адшукайце яго пад сваімі стулікамі. *(Пад кожным стулам захаваны сцікер з малюнкамі агародніны: агурок, гарбуз, капуста, сланечнік).*

Падумайце, што яднае ўсе гэтыя малюнкі і сфармулюйце тэму ўрока? *(Дзеці спрабуюць самастойна сфармуляваць тэму ўрока «Цікавая гародніна»).*

Звярніце ўвагу на план урока і адкажыце, што будзем ведаць і ўмець? *(ВЕДАЦЬ: як гучаць назвы агародніны на беларускай мове; УМЕЦЬ: называць расліны агароду па-беларуску).*

Дадатак 1.

**IV. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

*Забеспячэнне асэнсавання і першаснага засваення вучэбнага матэрыялу, вызначэнне правільнасці і разумення вывучанага матэрыялу.*

*4.1. Даследванне прапанаванай гародніны.*

Прапаную вам выканаць невялікае даследванне раслін агароду. ***(Дадатак 2)***

Першы пункт «Як гучыць на беларускай мове?»

*4.2. Гульневы прыем «Перакладчык».*

Як называецца месца дзе вырошчваецца агародніна? *(Агарод).*



Малюнак 1

Агароднік зрабіў градкі, але забыў, што і куды трэба пасадзіць. Дапамажыце яму. *(Суадносяць слова і малюнак).*

Дадатак 2.

*Прымацаваць магніт на пункт «Як гучыць на беларускай мове?», што сведчыць аб яго выкананні.*

*4.3. Наступны пункт «Колер». Вазьміце ліст блакітнага колеру.*

Дадатак 3.

Якая гародніна мае зялёны колер? *(Агурок, капуста).* Зафарбуйце агурок і капусту зялёным фламастэ-

рам.

Якая гародніна мае жоўты колер? *(Гарбуз, сланечнік).* Зафарбуйце гарбуз і сланечнік жоўтым фламастэрам.

*Прымацаваць магніт на пункт «Колер», што сведчыць аб яго выкананні.*

*4.4. Наступны пунк даследвання «Форма».*

Што з пералічанай агародніны мае круглую форму? Даўгаватую?

Намалюйце патрэбную геаметрычную фігуру пад кожным малюнкам агародніны. (Дадатак 3).

*Прымацаваць* ***магніт на пункт «Форма», што сведчыць аб яго выкананні.***

*4.5. Фізкультхвілінка. (Імправізацыя рухаў у такт верша).*

*Дзеці ў агарод ідуць,*
*А там гародніна расце,*
*дзеці спінкі нахіляюць,*
*І бурак яны зрываюць*[1].

*4.6. Наступны пункт «Знешні выгляд».*

Прапаную папрацаваць з мастацкімі творамі. Вазьміце лісты зяленага колеру.

Дадатак 4.

Тыя дзеці, у каго былі стыкеры з малюнкам агурка, працуюць з тэкстам пра агурок, у каго быў гарбуз — пра гарбуз і г.д.

*Пад час чытання можна прапанаваць вучням папрацаваць з алоўкамі і падкрэсліць словы-апісанні агародніны.*

Група 1

Выраслі наградцы
**Сакаўныя** братцы.
**Доўгія, шурпатыя,**
Вітамінаў шмат у іх.

(М.Пазнякоў)

Група 2

На гародзе стала пуста.
Толькі **пышная** капуста
Ветру, сцюжы не баіцца:
Мае цеплыя спадніцы.
Прыгожая, здаровая,
Уся **белагаловая.**

(Ларыса Геніюш)

Група 3

Гарбуз-**таўстапуз** —
я расту, расту, расту,
Расцянуўся на вярсту, —
Прабубнеў гарбуз-**таўстун.**
Ды зваліўся ў баразну,
Крышку высунуў спіну
І цішы, цяпле заснуў.
Хоць і спаў, ды рос і рос,
Ён усіх тут перарос,
**Не падняць** яго на воз.

(С.Шушкевіч)

Група 4

Цыбатыя сланечнікі

Пасадзіла Маша ўздоўж плота семкі сланечніку. Як прараслі, палівала, палола, рыхліла глебу.

Выраслі **сланечнікі цыбатыя**, вышэйшыя за дзяўчынку. З'явіліся на іх зяленыя шапачкі. Аднойчы яны закрасавалі, выпусцілі **жоўтыя пялёсткі**.

Убачыў сланечнікі Сяргейка і здзівіўся:

— На агародзе маленькія сонейкі на высокіх ножках!

Прайшоў час, і Сяргейка адзначыў:

— Цяпер у нас не сонейкі, а рабыя капелюшы на ножках.

Праверка:

Група 1. Чытайце загадку, астатнія адгадваюць.

*Пытанне да ўсіх вучняў: якія словы дапамаглі знайсці адгадку?*

Што азначае слова *шурпаты*? (*Грубы, калючы*). Злучыце ў сябе на лістах, а адзін вучань на дошцы словы-апісанні з агурком.

Група 2. Прачытайце верш, астатнія слухаюць і запамінаюць.

*Пытанне да ўсіх вучняў: пры дапамозе якіх слоў аўтар апісвае капусту?*

Прачытайце. Злучыце ў сябе на лістах, а адзін вучань на дошцы словы-апісанні з капустай.

Група 3. Прачытайце верш, астатнія слухаюць і запамінаюць, чым адметны гарбуз.

*Пытанне да ўсіх вучняў: пры дапамозе якіх слоў аўтар апісвае гарбуз? Чаму аўтар называе гарбуз таўстапузам?*

Злучыце ў сябе на лістах, а адзін вучань на дошцы словы-апісанні з гарбузом.

Група 4. Прачытайце твор пра сланечнік. Астатнія слухаюць і адказваюць на пытанне: *З чым параўноўвае аўтар сланечнік?*

Злучыце ў сябе на лістах, а адзін вучань на дошцы словы-апісанні са сланечнікам.

*Прымацаваць магніт на пункт «Знешні выгляд», што сведчыць аб яго выкананні.*

*4.7. Праблемнае пытанне.*

Што агульнага паміж агурком, гарбузом, капустай і сланечнікам, акрамя таго, што растуць яны ў агародзе? *(Многа вітамінаў, дапамагаюць змагацца з хваробамі).*

Прапаную выканаць заданні на лістах чырвонага колеру і даведацца «Чым карысны?» расліны агароду.

Кожная група шукае неабходную інфармацыю, затым злучаем агародніну з малюнкам таго, для чаго прыносіць карысць.

Дадатак 5.

Група 1: Агурок. У агурках ёсць магній, калій, вітаміны А і Б1, якія дапамагаюць нашай скуры і валасам выглядаць прыгожа.

*Дапаўненне настаўніка*: Агурок таксама паляпшае працу печані і сэрца.

Група 2: Капуста. У капусце ёсць калій, які дапама-

[1]Апошні радок паўтараецца, змяняецца толькі назва агародніны.

гае правільнай рабоце сэрца.

*Дапаўненне настаўніка:* Ужыванне капусты ў ежу дапамагае паменьшыць крывяны ціск.

Група 3: Гарбуз. У гарбузе ёсць каратын, які карысны для зроку. Ужыванне гарбуза ў ежу дапамагае яе лепшаму засваенню.

*Дапаўненне настаўніка*: Гарбуз — скарбніца вітамінаў, і немалая іх частка знаходзіцца не толькі ў мякаці, але яшчэ ў семечках і кветках.

Група 4: Сланечнік. У сланечніку ёсць вітаміны групы Б. Яны дапамагаюць нармалізаваць сон.

*Дапаўненне настаўніка:* Ужыванне пладоў сланечніка ў ежу дапамагае правільнай рабоце сэрца.

*Прымацаваць магніт на пункт «Чым карысны?», што сведчыць аб яго выкананні.*

*4.8. Фізкультхвілінка.*

*Ладкі, ладкі, ладкі*
*Мы палолі градкі.*
*Ад старannай працы*
*Выраслі на градцы*
*Вось такія агуркі,*
*Вось такія гарбузы,*
*А капусты качаны*
*І сланечнік жоўты —*
*Вось такой велічыні*
*Падарункі восені.*

Для чаго вырошчваюць расліны? *(Для ўжывання ў ежу).*

Пераходзім да апошняга пункта «Страва». Складзіце карцінкі з выявамі страў і назавіце іх. *(Раздаць разрэзаныя карцінкі ў групы: саленыя агуркі, запечаны гарбуз, галубцы, халва).*

Дадатак 6.

Праверка:

Якія стравы рыхтуюць з агуркоў? Капусты? Гарбуза? Якім чынам ужываецца сланечнік у ежы? *(Адказы вучняў).*

Якія стравы ёсць у нашай сталовай з гэтай гародніны? А дома матуля выкарыстоўвае гэтыя прадукты для прыгатавання ежы? *(Адказы вучняў).*

*Прымацаваць магніт на пункт «Страва», што сведчыць аб яго выкананні.*

**V. Этап замацавання ведаў.**

*Забеспячэнне замацавання і прымянення атрыманых ведаў навучэнцаў.*

*Інтэрактыўны метад «Кросенс».*

Вазьміце канверты і з прапанаваных картак з малюнкамі пры дапамозе клея запоўніце пустыя акошкі ў адпаведнасці з планам урока.

Дадатак 7.

**VI. Этап падвядзення вынікаў.**

*Даць якасную ацэнку работы класа, асобных вучняў.*

*Настаўнік аналізуе работу вучняў: называе самых актыўных, уважлівых, дысцыплінаваных, дапытлівых. Вяртаецца да мэты ўрока і ацэньвае сумесна з навучэнцамі ступень яе дасягнення.*

**VII. Этап рэфлексіі.**

*Арганізацыя рэфлексіі.*

Што робяць вашы матулі і бабулі з сабранай агароднінай, акрамя прыгатавання ежы? *(Робяць закаткі).*

Прапаную і вам «закатаць у банку» атрыманыя веды. Вазьміце, калі ласка, свае стыкеры. Расфарбуйце агародніну чырвоным колерам, калі вам зусім не спадабалася, чагосьці не ведаў, было сумна. Расфарбуйце агародніну сінім, калі штосьці было не так, зяленым, калі ўсё было выдатна. Прымацуйце свае стыкеры на дошку, згодна з крытэрыямі. *(На дошцы прымацаваны каляровыя банкі).* (Малюнак 2).



Малюнак 2

Даследванне завершана. Дзякуй вам за работу!

*Дата поступления в редакцию: 08.11.2023*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ ФАКУЛЬТАТИВНОГО ЗАНЯТИЯ «ВЕЛИКАЯ ОТЕЧЕСТВЕННАЯ ВОЙНА СОВЕТСКОГО НАРОДА (В КОНТЕКСТЕ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ)» В IX КЛАССЕ ПО ТЕМЕ «СОВЕТСКИЙ ТЫЛ В ГОДЫ ВОЙНЫ»

*Головачёва Наталья Николаевна*

**Цель:** изучить с учащимися вопрос о роли советского тыла в годы Великой Отечественной войны через приемы визуализации для развития критического мышления.

**Задачи:**

организовать работу по изучению темы «Советский тыл в годы Великой Отечественной войны»;

способствовать развитию критического мышления посредством работы с понятиями, иллюстрациями;

создать условия для развития у учащихся эмоци-